# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

31 снежня 2024 г. № 485 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту п а с т а н а ў л я ю:

1. За значны ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту, актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2024 года ў памеры 350 базавых велічынь кожнаму:

Вішнякову Генадзію Аляксеевічу, старшаму трэнеру нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па інваспорце ўстановы ”Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту“;

калектыву дзяржаўнай вучэбна-спартыўнай установы ”Віцебская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву № 1“;

Курачкінай Ірыне Аляксандраўне, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па барацьбе вольнай дзяржаўнай установы ”Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі ”Стайкі“.

2. Міністэрству фінансаў у 2025 годзе выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту і турызму сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2024 года з улікам памеру базавай велічыні на дату выплаты.

3. Вызваліць сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2024 года, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ · 1 ·
Для правовых актов

10